## АДЗІН З УСІХ І ЎСЕ З АДНАГО

Згубіць патрэбнага чалавека ў жорнах натоўпу гэтак жа проста, як самога сябе: на кожны твар тут прыпадае некалькі патыліцаў. Хто ведае, ці сустрэнемся мы з вамі ў гэтым рухомым лябірынце, ці ня станецца бясконцай сьцяна незнаёмых людзей паміж намі?

Бальшыня людзей незнаёмыя толькі таму, што бясконца кудысьці імчыць, даганяючы стрэлку гадзіньніка, і за лесам сьпінаў не заўважае працягнутых насустрач рук. Мы не здагадваемся, што толькі адзін аднаго і шукаем усё жыцьцё. Усе незнаёмыя людзі папросту не пасьпелі сустрэцца. І ўсё ж аднойчы мы, спадзяюся, спаткаемся — калі адважымся пералезьці бясконцы паркан стрэлак нашых гадзіньнікаў. Мы сустрэнемся за сьпінай часу — па той бок сусьветнага цыфэрбляту.

Сьледам за нашымі папярэднікамі мы цярпліва чакаем нараджэньня, паступленьня ў школу, потым — ва ўнівэрсытэт, чакаем нараджэньня ўласных дзяцей, выхаду на пэнсію і, нарэшце, пахавальнага маршу над сваёю труной. Заўсёды страшна паміраць чалавекам. Але яшчэ страшней было б паміраць апошнім — ведаючы, што твае памылкі ніхто ўжо ня выправіць.

Прыемна пачуць, як у сьпіну табе дыхае наступнае пакаленьне: пасьля нас — не патоп, а новыя людзі. Усялякая мара можа пасварыць нас з братамі па крыві, але нараджае нам братоў па духу. Ты толькі імкніся да чаго-небудзь, і ў цябе зьявяцца пасьлядоўнікі (а потым абавязкова адшукаюцца і папярэднікі). Зь іншага боку, калі зусім незнаёмыя людзі пачынаюць прыстасоўвацца адзін да аднаго, як-небудзь узгадняць свае паводзіны — у іх адразу зьяўляецца агульная справа, якая прымушае іх шыхтавацца адзін па адным.

Але жывы чалавек ніколі не належыць нейкай адной сыстэме адліку, ён існуе на скрыжаваньні розных грамадзкіх структураў. Рэч і назва ніколі не адпавядаюць цалкам адна адной; тое ж датычыць сьвету і сьветагляду, цела і ягонага імя, жыцьця і біяграфіі. Мы фатальна не супадаем з уласным лёсам: шмат хто ўпэўнены, што жыве ня ў той скуры, ня ў той краіне ці нават ня ў той галяктыцы. Ніводная ідэалёгія, праца, сям’я ня можа зьмясьціць нас цалкам: кожная патрабуе той альбо іншай ахвяры.

Паводле Фройда, у аснове чалавечага жыцьця і ўсёй цывілізацыі ляжаць бесьсьвядомыя памкненьні. Паводле Сартра, усё наадварот: нашае жыцьцё прадвызначаецца і кіруецца асабістым выбарам чалавека. На маю ж думку, чалавек ніколі не бывае ў сваім выбары самотны. Усялякі выбар мы сьвядома ці несьвядома робім ад імя пэўнага кола людзей, зьяднаных агульнай крывёю, навуковай школай ці фабрычным канвэерам.

Фройд меркаваў, што чалавек адбывае двайное існаваньне — як самамэта і як зьвяно ў ланцугу, якому ён прыналежыць супраць альбо неўпрыкмет для ўласнай волі. І аднак, нават у якасьці самамэты чалавек застаецца зьвяном ланцугу, але не бліжэйшага, а іншага, які абмінуў ягоных суседзяў. Кожны з нас належыць некалькім культурным традыцыям, можа працаваць у некалькіх установах, мець некалькі сяброўскіх колаў… Па сутнасьці, кожны мог бы сказаць пра сябе ня “я”, а “мы”. Ад шызафрэніі нас ратуе здольнасьць у кожны асобны момант атаясамняць сябе зь нейкім канкрэтным “я”, а пра астатнія забываць, выціскаць іх у падсьвядомасьць.

Людзі могуць думаць пра што заўгодна, і тым ня менш у любых дзьвюх галовах, нават з розных канцоў чалавецтва, знойдзецца нейкая агульная думка. Няма такой думкі, якая б панавала над розумам усіх людзей, але няма і такой, якая была б зразумелая толькі аднаму чалавеку. Мы ўжо сёньня ведаем штосьці з таго, што будуць ведаць нашыя нашчадкі празь мільёны гадоў. Чалавецтва шырэйшае за грамадзтва, як мысьленьне шырэйшае за аднадумства.

Прыналежнасьць да пэўнай традыцыі дазваляе нам падзяліць сьвет на лішняе і неабходнае, а людзей — на "нашых" і астатніх. Дастаткова мець хай сабе аднаго салідарнага, каб ужо можна было судзіць іншых і апраўдваць самога сябе. Калі адзін чалавек крыху падобны да іншага — ён ужо мае падставы меркаваць, што жыве не дарма.

Нічога дзіўнага, што людзей на сьвеце так шмат: хтосьці павінен паспрабаваць жыць паводле кожнага зь незьлічона магчымых сьветаглядаў. Нас было зусім няшмат, толькі двое, пакуль мы не спрабавалі спазнаць дабро і зло. Ня выключана, што ў райскім садзе, калі нам суджана будзе вярнуцца туды, месца хопіць таксама толькі двум. Альбо нават аднаму.

Альбэр Камю аднойчы запісаў у нататнік досыць дзіўную думку: "Кожны чалавек — першы, і ніхто першым не зьяўляецца". Напэўна, рэч ня толькі ў тым, што ўсе мы ў нечым паўтараем лёс Адама ці Евы. Кожны чалавек адораны здольнасьцю ўбачыць месца, куды яшчэ не ступала нага альбо думка ніводнага папярэдніка, знайсьці нешта такое, што згубілі ў сваіх падліках іншыя людзі. Кожны з нас нараджаецца і памірае як шанец скіраваць гісторыю ў нейкае новае рэчышча.

Але больш цікавай мне падаецца іншая інтэрпрэтацыя думкі Камю: якімі б несумяшчальнымі, "пэрпэндыкулярнымі" ні выглядалі розныя веравызнаньні, навуковыя школы ці іншыя каардынаты духу, яны ўтвараюць не "хмызьняковую" структуру выбуху мэнтальнай энэргіі ва ўсе бакі, а нейкую замкнёную сыстэму, зачараванае кола, у якім адзін на ўсіх чалавек пражывае ўсе нашыя лёсы — наступнічае і папярэднічае самому сабе.

Чарга (у тым ліку чарга нараджэньняў, паміраньняў і ўваскрасеньняў) — гэта сытуацыя, у якой ня мы выбіраем, а выбіраюць з нас. І толькі ў стане сусьветнага "я" ўсе мы — абраныя.

Салідарнасьць зь мёртвымі і ненароджанымі прылучае нас да мінуўшчыны й будучыні ўсяго чалавечага роду. У гэтым паўнакроўным ланцугу індывід пакідае быць "чалавекам-у-сабе" і становіцца адным зь незьлічоных абліччаў "чалавека-ва-ўсіх". Мы больш чым сябры альбо ворагі адзін аднаму. Чалавек чалавеку — ён сам, які нарадзіўся і жыў у іншых абставінах.

Мы рэдка азіраемся, часьцей глядзім перад сабой і, адпаведна, бачым пераважна сьпіны людзей і краінаў, якія нас выперадзілі. Наперадзе ў нас — толькі чужая мінуўшчына. Але і мы самі — нейчая будучыня. Калі мы разьвітваемся без шкадаваньня, не адчуваючы болю — значыцца, нам проста не хапіла часу, каб хоць аднойчы ўсьміхнуцца адно аднаму і разгледзець у незнаёмым суседзе спачатку чалавека, а потым і самога сябе.

Людзей у сьвеце шмат, а чалавек адзін. І па чарзе кожны з нас бывае ім.